Нефармат

Пад якім вуглом глядзець на віно?

Гэтым разам з усіх калядных віншаванняў, якія я атрымала, адно выдзеліла асабліва. Па-першае, яно напісана рукой на паштоўцы, што цяпер — рэдкасць, а па-другое, змяшчае палеміку з адным з маіх леташніх матэрыялаў. Не ведаю, ці згодны аўтар на тое, каб я называла яго прозвішча, таму на ўсялякі выпадак не называю.

Спадар Павел з Гродна нагадвае калонку за 20 верасня пад назвай «Людзі жывуць у чарках...» — ён лічыць, што я не напісала галоўнага: карані адной з найвялікшых заган нашага грамадства ў тым, што людзі забыліся пра Бога. А ў Бібліі сказана: «Не глядзі на віно». Спрачацца не буду. І ў нейкім высокім, глабальным сэнсе так яно і ёсць. Калі людзі страчваюць аснову, стрыжань, на якім трымаецца душа, які падсвядома кіруе паводзінамі і ўчынкамі чалавека, здараецца бяда. Нехта гэтую аснову называе Богам, іншыя лічаць прынцыпамі маралі, якія, дарэчы, і будуюцца на падмурках знакамітых дзесяці запаведзяў.

Нездарма ж Вальтэр гаварыў: «Калі б Бога не было, яго варта было б прыдумаць». Чалавек — істота слабая, яму патрэбен нейкі стрымліваючы фактар. Сведчаннем таму ўся чалавечая гісторыя. Як вядома, у старажытнасці на цяперашняй еўрапейскай тэрыторыі нормай лічыліся розныя оргіі, ці калектыўная распуста, якія абавязкова падаграваліся п'янкай. Потым здараліся катаклізмы, палітычныя і прыродныя, — тут можна згадаць «Апошні дзень Пампеі» Брулова як напамін людзям пра непрымальны лад жыцця... Хрысціянства за два свае тысячагоддзі шмат зрабіла для павышэння культуры і выхавання грамадскай маралі. Адным з набыткаў гэтага выхавання можна лічыць тое, што напівацца стала сорамна. П'янства асуджалася любой чалавечай супольнасцю. У многім такі падыход падтрымліваўся менавіта ўплывам рэлігійных устаноў. У вёсцы любы бацюшка мог паўшчуваць аматара чаркі, і той стараўся лішні раз не трапіцца на вочы святару. Потым рэлігію адмянілі, храмы паразбуралі. У савецкі час ролю духоўных вартавых з пераменным поспехам выконвалі парткамы. Праблема, вядома, была — нездарма ж прымалі шматлікія пастановы аб барацьбе з п'янствам. А ў постсавецкі час яна яшчэ больш абвастрылася.

Піць, напівацца, тапіць сваё жыццё ў віне стала... не сорамна. Цяперашні індывід разважае так: «Я свабодны чалавек у свабоднай краіне, магу распараджацца сваімі сродкамі і сваім жыццём так, як хачу». І гэта правільна з пункту гледжання закона ў дачыненні да асобна ўзятага індывіда. А ў дачыненні да грамадства няправільна. Бо п'яныя часцей за цвярозых здзяйсняюць злачынствы. Адна з шараговых навін апошніх дзён: на вяселлі пабіліся сваты, для аднаго справа скончылася рэанімацыяй. П'яныя забіваюць на дарогах іншых. Яны ж нярэдка самі гінуць па розных прычынах ды пакідаюць уласных дзяцей, сужэнцаў, бацькоў без падтрымкі. Нядаўна адна старшыня сельскага Савета падзялілася сумным назіраннем. У даволі вялікай вёсцы, па ўсіх прыкметах перспектыўнай, яна налічыла каля 50 адзінокіх мужчын ад 35 да 55 гадоў, якія выпіваюць. Гэта значыць, яны не стварылі сем'яў, не аддалі доўг соцыуму і знайшлі сэнс жыцця ў той самай чарцы. І самае сумнае, што такое становішча лічаць нармальным.

А што? Уключы тэлевізар — там спрэс «прыгожае жыццё», аздобленае або зграбным бакалам, або гранёнай чаркай. Нярэдка гэта падаецца з дасціпным гумарам, нават з налётам рамантыкі. Аднойчы сталы, з усімі рэгаліямі артыст расказваў пра значэнне выразу «Не па таленце п'еш». Нібыта было ў іх адмысловае кафэ, дзе любілі адпачываць артысты, ну і захоўваўся там пэўны кодэкс паводзін. Народныя маглі напівацца да гарызантальнага становішча, заслужаныя мусілі піць менш, а тыя, хто без рэгалій, дазвалялі сабе зусім крышку, каб потым адвезці дамоў народных, пасадзіць у таксі заслужаных. А хто дазваляў сабе больш, яму казалі: «Не па таленце п'еш». Што ж, таленавітыя людзі і пакпіць з сябе ўмеюць таленавіта. Дарэчы, многія і многія творчыя асобы, лічы, загінулі ад гэтай навалы.

А нашаму абываццелю, асабліва таму, хто не вельмі абцяжараны адукацыяй ды выхаваннем, духоўным багажом, калі не прыгожае жыццё, дык яго алкагольная «прыправа» заўсёды даступныя. Мяжа паміж забавай-звычкай і хваробай вельмі хісткая, яе часта не заўважаюць. Адсюль пачынаюцца сямейныя, асабістыя трагедыі, рушацца лёсы і жыцці, пакутуюць дзеці.

...Сёлета на свята Богаяўлення малады святар у нашай царкве сказаў падчас пропаведзі: «Шостую запаведзь «Не забі» не варта разумець так, што нельга толькі забіваць іншага. Нельга забіваць і сябе: алкаголем, наркотыкамі, іншымі дрэннымі прывычкамі». Правільна, добра сказана. Ізноў падыходзім да таго, што спадар Павел з Гродна назваў галоўным. Толькі вось як павярнуць многіх сучаснікаў у бок галоўнага, ні я, ні спадар Павел, падобна на тое, не ведаем...

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.09	17.34	8.25
Віцебск —	9.05	17.18	8.13
Магілёў —	9.00	17.24	8.24
Гомель —	8.50	17.28	8.38
Гродна —	9.24	17.51	8.27
Брэст —	9.18	17.58	8.40

Месяц

Поўня 21 студзеня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра, Фёдара.*
К. *Мілены, Рафала, Роберта, Фелікса, Феліцыі, Францішка, Цімафея, Эрыкі.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

24 СТУДЗЕНЯ

1895 год — у Мінску ўведзена ў дзеянне першая электрастанцыя. Найбуйнейшая ў Беларусі з ліку муніцыпальных. Знаходзілася на правым беразе Свіслачы, побач з сучасным будынкам Беларускага дзяржаўнага цырка. Яе адкрыццё дазволіла ўстанавіць 390 лямпачак напальвання: 140 для асвятлення вуліц Петрапаўлаўскай, Праабражэнскай, Губернатарскай, Захар'еўскай, 140 у зімовым і летнім тэатрах і 110 у прыватных спажыўцоў. Гараджане хутка ацанілі перавагу новага віду асвятлення, і ўжо праз тры гады горад меў 1100 лямпачак напальвання ў 16 свечак: 240 на вуліцах, 420 у тэатрах і 430 у прыватным спажыванні.

1909 год — нарадзіўся (вёска Зачэпічы, цяпер у Дзятлаўскім раёне) Пятрусь Граніт (Іван Пятровіч Івашэвіч), беларускі паэт. Удзельнічаў у рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбе ў Заходняй Беларусі і партызанскім руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Друкавацца пачаў у 1933 годзе. Асноўная тэма паэтычных твораў да верасня 1939-га — лёс вясковай беднаты. Заклікаў працоўных Заходняй Беларусі да ўз'яднання з БССР. У пасляваеннай творчасці пераважалі грамадскія матывы. Пісаў таксама вершы для дзяцей. Памёр у 1980 годзе.

1939 год — у Мінску заснавана Дзяржаўная карцінная галерэя БССР (адкрыта 8 лістапада 1939 года). З 1957 года — Дзяржаўны, а з 1993-га — Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. У музеі працуюць аддзелы: навукова-асветніцкай работы, навукова-фондавы, старажытнабеларускага мастацтва, беларускага сучаснага мастацтва, рускага мастацтва, замежнага мастацтва, навуковай рэстаўрацыі, інфармацыйна-выдавецкі, фоталабараторыя, архіў. Калекцыя ўключае творы беларускага, расійскага і заходнееўрапейскага мастацтваў і мастацтва краін Усходу XV—XX стагоддзяў. Беларускае мастацтва прадстаўлена старажытнабеларускім іканапісам, скульптурай, тканінамі і разьбой па дрэве, жывапісам, творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.



1848 год — пачалася Каліфарнійская «залатая ліхаманка» — неарганізаваная масавая здабыча золата ў Каліфорніі ў 1848—1855 гадах. Пачалася яна непадалёк ад лесапільні Сатэр каля гарадка Калома. Нейкі Джэймс Маршал, які працаваў на Джона Сатэра, выявіў кавалачкі золата ў вадзяным коле на рацэ Амерыкан-Рывер. Ён аднёс знаходку Сатэру, і ўдваіх яны старанна праверылі метал, пацвердзіўшы здагадку аб тым, што гэта было золата. Сатэр вельмі не хацеў, каб гэтая інфармацыя распаўсюдзілася, бо баяўся, што яго сельскагаспадарчы бізнес пацерпіць у выпадку пачатку масавых пошукаў золата. Тым не менш навіна пра выяўленне золата імкліва распаўсюдзілася, і неўзабаве каля 300 тысяч чалавек прыбылі ў Каліфорнію з іншых штатаў ЗША і з-за мяжы.

1944 год — пачалася Корсунь-Шаўчэнкаўская наступальная аперацыя савецкіх войскаў. З'яўлялася часткай стратэгічнага наступлення Чырвонай Арміі на Правабярэжнай Украіне (Дняпроўска-Карпацкая аперацыя, або першым з так званых знакамітых дзесяці сталінскіх удараў). Аперацыя завяршылася 17 лютага 1944 года ліквідацыяй катла і частковым разгромам акружанай групоўкі.

1955 год — падпісаны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб спыненні стану вайны паміж Савецкім Саюзам і Германіяй».

УСМІХНЕМСЯ

Любіце жонку — надзейную крыніцу ведаў аб усіх вашых недахопах.

На тэлебачанні.

— Хрысціне яе тата купіў фірму, і цяпер Хрысціна нам раскажа, як адкрыць свой бізнес «з нуля» і на што звярнуць увагу!

А вы таксама не можаце растлумачыць свайму кату, што дапамога ад яго пры засціланні ложка, прыборцы кватэры, збіранні бялізны ў мыццё, а таксама пры надзяванні калготак НЕ ПАТРАБУЕЦЦА?..

— Як ты песціш свайго мужа?

— Часам маўчу.

Халадзільнікі трэба рабіць з празрыстымі шкляннымі дзверцамі, каб не стаяць перад адчыненымі дзверцамі як дурань, выбіраючы, што б узяць.

Адэса.

— Фіма, куды ўсе бягуць? Што там даюць?

— Па твары!

— Па цэлым?!



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 145.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12